**КЛА́ДНІК**, К л а д а в і к, дух, які валодае скарбам і ахоўвае незлічоныя багацці. Апранаецца ў сярэбраную світку з залатым поясам, на галаве — канічная шапка з літога золата. Абуваецца ў сярэбраныя лапці або ў боты з залатымі мысамі. У руках трымае дарожны кій з чыстага серабра і залатымі булдавешкай і наканечнікам. Уся хатняя абстаноўка К. ззяе ад каштоўных металаў і камянёў, што служыць яму для асвятлення ў доме і ў дарозе. Аднак пры гэтых багаццях К. застаецца бедняком, бо з гэтага не бярэ і драбніцы на свае харчовыя патрэбы. Ад худобы ледзь перасоўвае ногі. У яго сярэбраным кашалі валяецца ўсяго толькі недаедзеная ўкрадзеная ці выпрашаная, як міласціна, хлебная скарынка. Сквапнасць К. выпрацавала ў ім злосць і на людзей, і на сваіх братоў: з першымі ён не ўступае ў кантакт, а ў другіх бачыць пасягальнікаў на дабро, якое сцеражэ і якое павінна памнажацца за кошт ахвяры ці пагібелі яе душы. К. загубілі шмат людзей, што няспынна цягнуцца да скарбаў. Амаль усе скарбы з'яўляюцца крадзеным ці здабытым праз разбой дабром. Таму на іх ляжыць праклён, які і губіць іх шукальнікаў. Калі нейкі ўладальнік багацця хавае яго ў зямлю і накладвае закляцце, К. падхоплівае дабро і нясе яго ў глыбіню, а чалавек, перастаючы быць гаспадаром скарбу, зможа зноў яго ўбачыць толькі тады, калі надумаецца нешта дакласці. Скарбам можа спакусіцца інш. шукальнік лёгкай нажывы. К. падымае скарб да паверхні зямлі і назірае за скнарам, пакуль той не заключыць здзелку з нячысцікам. Зрэдку К. выстаўляе скарбы дзеля праветрывання, і гэты момант можа стаць зручным для захопу багацця, вядома, калі самога К. не будзе паблізу.

*Літ.*: Н и к и ф о р о в с к и й Н. Нечистики, свод простонародных в Витебской Белоруссии сказаний о нечистой силе. Витебск, 1995.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ